# ПРАЕКТЫ РЭСТАЎРАЦЫІ ЗАМКА Ў ЛЮБЧЫ Ў 1986–2017 гг.

***З. В. Савельеў,***
*галоўны архітэктар праектаў Цэнтра па рэгенерацыі гісторыка-культурных ландшафтаў і тэрыторый*

Замак у г. п. Любча вядомы з канца XVI ст., калі вялося яго будаўніцтва магнатам Янам Кішкай. У пачатку XVII ст. замак быў яшчэ не дабудаваны, а з пазнейшых інвентароў вядома, што меў драўляныя часткі. Да канца XIX ст. ад замкавых збудаванняў захаваліся дзве мураваныя вежы, руіны яшчэ адной вежы і частка абарончых муроў. У сярэдзіне XIX – пачатку XX ст. вялося будаўніцтва новай палацава-паркавай рэзідэнцыі, куды ўвайшлі дзве мураваныя вежы – Брамная і Кутняя. У часы I Сусветнай вайны неагатычная палацавая частка рэзідэнцыі была разбурана. Пасля II Сусветнай вайны палац быў адбудаваны і разам з флігелем і Брамнай вежай прыстасаваны пад школу, а Кутняя вежа была закінута. Аднаўленчыя працы на замку вядуцца з 2003 г. прыватным дабрачынным фондам «Любчанскі замак».

Першы праект аднаўлення быў распрацаваны ў 1986 г. ВА «Белрэстаўрацыя» пад кіраўніцтвам архітэктара Л. Баркуна. Распрацаванаму архітэктурнаму праекту і будаўнічаму праекту па Кутняй вежы (першы этап аднаўлення) папярэднічалі археалагічныя даследаванні ў 1983–1985 гг. (І. Чарняўскі), гісторыка-бібліяграфічныя даследаванні (С. Адамовіч), а таксама архітэктурна-археалагічныя абмеры і натурныя вышуканні [3]. У выніку прапанаваны праект прадугледжваў рэстаўрацыю замка як палацава-паркавага комплексу на пачатак XX ст. з некаторымі дадатковымі аднаўленчымі працамі і прыстасаваннем комплекса пад санаторый «Лідсельмаша». У праекце захаваныя падмуркі сцен паміж вежамі павінны былі быць адбудаваныя на 1 м, каб захаваць візуальную сувязь паміж палацам і паркам, і толькі каля вежаў мелі аднаўленне гіпатэтычнага выгляду на ўсю меркаваную вышыню. Брамная і Кутняя вежы ў праекце атрымалі стромкі пірамідальны дах, крыты дахоўкай. Абрамленне аконных праёмаў і гзымсаў на вежах прадугледжвала выкананне сграфіта. Таксама аднаўляліся два драўляныя масты праз замкавы роў. З боку былога

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фальварка планавалася збудаваць сучасны будынак сталовай. Гэты праект не быў рэалізаваны.




*Мал. 1.* Праект 1986 г.

Наступны праект паўстаў у 2004 г. як фрагмент рэстаўрацыі замка ў выглядзе аднаўлення завяршэння Кутняй вежы і абарончай сцяны паміж Кутняй і Брамнай вежамі. Праект распрацаваны УП «МШ прафесара В. Аладава» [1] (навук. кіраўнік У. Кандратаў, Л. Баркун, А. Кропатаў; архітэктары В. Аладаў (ГАП), А. Шулаеў). Гэты праект прадугледжваў выкананне кансервацыйнага (фактычна часовага) спічастага гатычнага даха, аднаўленне гзымса, сграфіта на гзымсе і ў абрамленні вокнаў, адбудову лесвічнай цагляна-вахверкавай прыбудовы ў гіпатэтычнай форме на пачатак XVIIст., а таксама на той жа час адбудову абарончай сцяны ў гіпатэтычнай форме. Канцэпцыя 2004 г. засведчыла, што выкананне поўнай рэстаўрацыі замка на XVI ст. немагчыма, і было прапанавана дапрацаваць праект 1986 г. з улікам новых даследаванняў: выканаць фрагментарную рэстаўрацыю Брамнай і Кутняй вежы, флігеля і бліндажа часоў I Сусветнай вайны; аднавіць выгляд неагатычнага палаца на пачатак XX ст. і падпорнай сцяны ўздоўж Нёмана; аднавіць абарончы мур, палац Радзівілаў і масты з

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУКИ

замка ў мястэчка і фальварак; выявіць сродкамі добраўпарадкавання дзве наднёманскія вежы, жылы корпус XVI ст. і іншыя пабудовы [7].

З 2011 г. ТАА «Цэнтр па рэгенерацыі гісторыка-культурных ландшафтаў і тэрыторый» вялася карэкціроўка праекта 2004 г. і распрацоўка новага будаўнічага праекта рэстаўрацыі Брамнай вежы на аснове праведзеных у 2009–2010 гг. натурных даследаванняў Брамнай вежы [2]. Але замест цэластнага будаўнічага праекта рэстаўрацыі Брамнай вежы гэтым праектам было прадугледжана толькі рэканструкцыя купальнага завяршэння.




*Мал. 2.* Праект 2012 г.

У 2012 г. ТАА «Цэнтр па рэгенерацыі гісторыка-культурных ландшафтаў і тэрыторый» быў распрацаваны канцэптуальны праект рэстаўрацыі замка [5], а ў 2013 г. ААТ «Белрэстаўрацыя» гэты праект быў перапрацаваны і ўзгоднены Міністэрствам культуры. Праектам прадугледжана адбудова ў гепатэтычнай форме паўночнай наднёманскай вежы замка, будаўніцтва драўлянага палаца на паўночна-ўсходнім баку замка, стварэнне альтанкі, якая нагадвае ўсходнюю вежу, што не захавалася, узвядзенне шкляной устаўкі паміж Брамнай вежай і флігелем замест існаваўшага драўлянага перахода, а таксама карэкціроўка папярэдніх праектаў з улікам ужо выкананых дэ-факта будаўнічых і аднаўленчых прац на замку, якія не ўвайшлі ў папярэднія праекты [4].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 2017 г. прыватным прадпрыемствам «Проектив» быў распрацаваны архітэктурны праект рэканструкцыі замка ў Любчы ў двух варыянтах. Асноўным падыходам захавання замка вызначана матэрыялізацыя адноўленых і новых форм на ўмоўнай паверхні [5]. У адрозненне ад праекта 2013 г. у першым варыянце капітальная адбудова ў гепатэтычных формах прадугледжана не толькі для паўночнай, але і ўсходняй вежы і часткова для некаторых сцен замка, а ў другім варыянце паўночная і ўсходняя вежы і сцены адбудаваны ў легкіх канструкцыях па тыпу «жалюзі». У той жа час няма аднаўлення драўлянага палаца і маста на паўночна-ўсходнім баку замка.

Трэба таксама дадаць, што ў 2006–2012 гг. у межах дыпломных праектаў (БДАМ, БНТУ, ПГУ) распрацоўваліся розныя канцэпцыі рэстаўрацыі замка.

Пры разглядзе праектаў рэстаўрацыі за 1986–2017 гг. можна зрабіць наступныя высновы. Для савецкай рэстаўрацыйнай школы была характэрна кансервацыя з фрагментарнай рэстаўрацыяй на аснове навуковых дадзеных, дзе галоўным з'яўлялася захаванне аўтэнтычных элементаў, у адрозненне ад сучасных неарэалістычных падыходаў матэрыялізацыі страчаных частак і выканання гепатэтычнай копіі, дзе навуковыя дадзеныя могуць падлягаць кампіляцыі і інтэрпрэтацыі. У праекце 1986 г. асноўнай мэтай было з дапамогай новай функцыі выканаць захаванне замка сродкамі кансервацыі і рэстаўрацыі; у праектах з 2004 г. па 2012 г. вяліся пошукі падыходаў рэстаўрацыі замка пры правядзенні фрагментарнай рэстаўрацыі і адбудове замка; у праектах пасля 2012 г. функцыя адыходзіць на другі план і адбудова страчаных частак замка з'яўляецца мэтай захавання. Амаль усе праекты разглядаюць замак выключна асобна і не ўлічваюць сувязь замка з навакольным культурным ландшафтам.

---

*1.* Аб'ект № 101/04-Р «Замок в г. п. Любча Новогрудского района Гродненской области. Завершение угловой башни. Корректировка проекта 1986 г.»

*2.* Аб'ект № 1250-2011-АР Рэстаўрацыя Брамнай вежы на гісторыка-культурнай каштоўнасці «Фрагменты замка (XVI–XIX стст.): вежы, земляныя ўмацаванні з рэшткамі аборончых збудаванняў, флігель, палац».

*3.* Аб'ект № 216-83. Архіў вытворчага аб'яднання «Белрэстаўрацыя».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Астаповіч: У Любчы на сярэднявечным замку могуць з’явіцца цыбуліны // Наша Ніва. – 2013. – 18 лістап. – Рэжым доступу : https://nn.by/?c=ar&i=117994. – Дата доступу : 27.03.2018.
5. *Зайцев, А.* Материализация любчанского замка: компромисс или контекст / А. Зайцев // Архитектура и строительство. – 2017. – № 4. – С. 34–39.
6. *Савельев, Д. В.* Концепция музеефикации замка в г. п. Любча / Д. В. Савельев // Культурно-образовательная деятельность библиотек и музеев в региональных измерениях : материалы междунар. науч.-практ. конф., 10 февр. 2015 г. – Смоленск, 2015. – С. 51–56.
7. *Шулаеў, А.* Рэстаўрацыя замка ў Любчы / А. Шулаеў // Архитектура и строительство. – 2008. – № 11. – С. 66–68.

# ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ БРЕСТСКОГО ОТДЕЛА ФОНДА РУССКОЙ ШКОЛЫ В МЕЖВОЕННЫЙ ПЕРИОД

***Н. В. Самосюк,***
*кандидат культурологии, старший преподаватель*
*кафедры истории славянских народов*
*Брестского государственного университета имени А. С. Пушкина*

Русская общественность г. Бреста всегда ради общего дела могла идти на компромиссы, сглаживать противоречия между отдельными представителями центральных организаций. Приоритетным направлением ее деятельности являлось содержание гимназии и начальной школы. В межвоенный период русские учебные заведения, созданные для воспитания подрастающего поколения в традициях своей родной культуры, являлись частными по своему статусу и, следовательно, не имели никакой государственной поддержки. Русская общественность стремилась дать возможность детям своих соотечественников даже из самых бедных семей получить образование в русских учебных заведениях.

В начале 30-х гг. XX в. Министерство вероисповеданий и народного просвещения выдвинуло требование по унифицированию учебников для детей, в том числе обучающихся в частных учебных заведениях. Для русских учебных заведений издание комплектов учебников для всех классов начальных школ и гимназий было очень сложной задачей, в первую очередь в материальном отношении [1].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ